[1] Боянков П., священник. Православное Братство во имя Архистратига Божия Михаила // "Акно". - 1997. - № 2 (20). - С. 73-75.
[2] Боянков П., священник. Издания православного братства во имя Архистратига Божия Михаила Минской епархии // Матэрыялы міжнарод. навук.-практ. канф. "Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі. Гісторыя і сучаснасць". - Мн., Тэхналогія, 1997. - С. 41-42.

Г. І. Кацуба

# КНІЖНАЯ КУЛЬТУРА Ў СІСТЭМЕ ДУХОЎНЫХ І МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ: ПОГЛЯД ПРАЗ ПРЫЗМУ ГОМЕЛЬСКАГА МУЗЕЯ

Храмамі муз называлі музеі старажытныя рымляне і грэкі. Гэта былі мясціны, прысвечаныя вывучэнню навукі і мастацтва. Яркімі прыкладамі гэтаму факту служыць існаванне Александрыйскага музея, бібліятэкі Ніневійскага палацу ў Асірыі і г.д.

Краязнаўца Г.Каханоўскі піша, што "вывучаючы нашу старажытную гісторыю, разглядаючы непарыўны ланцуг традыцый аховы ранніх помнікаў, нельга не назваць імя Еўфрасінні Полацкай, якая перапісвала летапісы, множыла іх, ратавала ад забыцця. І ў Кірылы Тураўскага жыло жаданне зацікаўленага асветніка захаваць матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці"[1].

У шматлікіх сярэдневяковых гарадах і мястэчках Беларусі, дзе працавалі школы, ствараліся і ахоўваліся летапісы, хронікі, меліся бібліятэкі, а ў некаторых месцах адкрываліся скарбцы, нумізматычныя кабінеты, мастацкія калекцыі, музеі (напрыклад, пры Полацкай езуіцкай калегіі і інш.). У сувязі з гэтым хочацца нагадаць імёны Радзівілаў, Храптовічаў, Тышкевічаў, Тызенгаўза, Чартарыйскіх і г.д.

Заснавальнікамі збору і захавання дакументальных помнікаў можна лічыць і старасту Гомельскага замка Міхаіла Чартарыйскага, які пры пабегу (пасля далучэння Гомеля да Расійскай імперыі) звёз "важные документы, касательно Гомеля и королевские грамоты и пр."[2]. Паводле звестак Л.Вінаградава, знаўцы гомельскай даўніны канца XIX – пачатку XX ст., "архив Чарторийских хранится в Кракове в музее их имени и недоступен для публики"[3].

Спадкаемцам Чартарыйскага стаў М. П. Румянцаў, які збіраў калекцыі старадаўніх прадметаў у Гомелі, арганізоўваў спецыяльныя экспедыцыі па зборы разнастайных матэрыялаў. Вядомы даследчык Г.Каханоўскі лічыць, што "на деньги графа в 1824 г. в Москве была издана первая часть "Белорусского архива древних грамот", собранная И. И. Григоровичем, любимым воспитанником графа, впоследствии протоиереем, археографом"[4]. Таксама на ягоныя грошы

былі надрукаваны "Збор дзяржаўных грамат і дагавораў", "Помнікі расійскай славеснасці XII ст." Многія з яго збораў пазней увайшлі ў фонды Маскоўскай бібліятэкі і Румянцаўскага музея ў Пецярбургу.

Безумоўна, не з'яўляючыся тутэйшым ні па паходжанні, ні па духу, Румянцаў не дбаў пра развіццё беларускай навукі. Такім чынам, для Беларусі ён стаўся ў некаторым сэнсе рабаўнікам; але ж і сённяшнія ўлады ў Расіі не спяшаюцца вяртаць вывезеныя багацці... Хаця нельга адмаўляць і тое, што граф Румянцаў, а потым і яго сын клапаціліся пра Гомель. Так, напрыклад, імі былі пабудаваны цэрквы і касцёл, іншыя грамадскія ўстановы.

У 1834 г. Гомель пераходзіць да графа, генерал-фельдмаршала І.Ф.Паскевіча, які займеў нядобрую славу жорсткага "покорителя" нашага краю і Польшчы (жорстка падавіў паўстанне 1831 г.)[5]. Ён таксама шмат увагі надаваў горадабудаўніцтву. А яшчэ Паскевіч вядомы тым, што меў "богатое собрание разных предметов изящных искусств", якія "делают гомельский замок настоящим историко-археологическим музеем"[6].

З надыходам савецкай улады змяніўся і погляд на культуру. Хаця тэарэтычна і падтрымліваліся культурніцкія праграмы, як, напрыклад, гэта бачна са зварота Народнага камісарыята асветы ў 1917 г. "Да працоўных, сялянаў, салдатаў і матросаў і ўсіх грамадзянаў Расіі", дзе вялася гаворка аб тым, што працоўныя "акрамя багаццяў натуральных атрымалі ў спадчыну яшчэ і культурныя: будынкі незвычайнай прыгажосці, музеі, поўныя прадметаў рэдкіх і цудоўных, што ўзвышаюць душу і розум, бібліятэкі, што захоўваюць незлічоныя багацці і г.д. Сапраўды, усё гэта цяпер належыць народу"[7]. Але, як паказаў час, да ўсіх гэтых каштоўнасцей сучаснікі ставіліся па-варварску.

У фондах Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці захоўваецца выдадзеная ў кастрычніку 1918 г. "Інструкцыя па былых землеўласніках і іхняй маёмасці", у якой гаварылася, што "каштоўнасці да спецыяльнага загаду не вывозяцца, а бяруцца пад ахову"[8]. Гомельшчына разам з далучанымі да яе ўездамі Менскай і Чарнігаўскай губерній стварылі для пададдзела па справах музеяў і ахове помнікаў мастацтва і даўніны шырокае поле дзейнасці: у барскіх сядзібах засталося шмат безгаспадарчай маёмасці, таму менавіта пададдзел прыняў на сябе ролю размеркавальніка гэтых каштоўнасцей паміж культурна-асветніцкімі ўстановамі. І не толькі паміж імі: "дзіцячыя дамы, бібліятэкі, клубы, Губкам, Гаркам, Губернскі аддзел па ахове здароўя, Губнарасветы, Губфінаддзел"[9] – каму толькі не дасталіся гэтыя рэчы; але спачатку была экспертыза, дзе ўсе прадметы, што не маюць строгага навуковага, гістарычнага або мастацкага значэння, размяркоўваліся ў вышэйпералічаныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстановы. А найбольш каштоўныя і рэдкія прадметы былі вывезеныя ў Маскву "на зберажэнне", да прыкладу:

- "самыя рэдкія выданнні рукапісаў, нумізматычныя і геральдычныя калекцыі – у Румянцаўскі музей;

- сямейныя архівы і хронікі заходнерасійскай (г.зн. беларускай) радавітай арыстакратыі – у Галоўархіў;

- мастацкія калекцыі - у Дзяржаўны музейны фонд і г.д."[10]

У 1919-1921 гг. у Гомелі пачынае ствараціа шэраг музеяў, такіх як педагагічны, прамысловы, медыцынскі, музей друку (які ў 1921 г. прапаноўвалася ліквідаваць, перапрафіляваўшы яго ў чытальню і філіял аддзела Цэнтральнай бібліятэкі"[11]), музей імя Луначарскага.

Гомельскі музей імя А.В.Луначарскага – адна з тых скарбонак, што цесна звязана з гісторыяй Гомельшчыны. На працягу амаль 150 гадоў збіраліся рэчы, якія паслужылі падмуркам музея. "Гомельскі Савет працоўных і салдацкіх дэпутатаў летам 1917 г. пад уплывам бальшавікоў загадаў рэквізаваць для сваіх патрэб замак княгіні Паскевіч, а маёмасць і каштоўнасці ўзяць пад сваю ахову"[12].

Але гэтага не магло быць, бо да 1923 г. не была апісана маёмасць палаца, "рэчы, якія не супадалі з вопісам 1896г., прапаноўвалася спісаць"[13]. Пра тое, што маёмасць была не рэквізавана і апісана, сведчаць і меркаванні некаторых гомельскіх даследчыкаў: "На трэці дзень пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі княгіня Паскевіч саставіла спіс усёй маёмасці і прынесла дарчую ў рэўкам"[14]. Аб гэтым сведчыць і тое, што "да 1923 г. княгіня і яе дварэцкі фактычна распараджаліся ўсёй маёмасцю"[15].

Нечакана Гомель акупавалі нямецкія войскі. Яны выставілі каля сядзібы ахову, нічога не было кранута. А з 24 па 29 сакавіка 1919 г. паўстаў полк пад кіраўніцтвам афіцэра Стракапытава. Мяцежнікі захапілі палац – каля яго вяліся баі"[16]. Але Стракапытаў імкнуўся ахоўваць усё гэтае багацце, а чырвонаармейскія часткі, накіраваныя на падаўленне мяцежу, адкрылі па палацы агонь. У выніку той "загарэўся, а пажарныя агонь не змаглі патушыць… 31 сакавіка 1919 г. эмісар музейнага аддзела Наркамасветы Пашуканіс, прыбыўшы для вывазу рэчаў з Гомеля ў Маскву, тэлеграфаваў: "Галоўны дом Паскевіча згарэў. Большая частка рэчаў і ўсе каштоўнасці выратаваны. Каштоўнасці вывезены ў Маскву"[17].

З рэштак застаўшыхся каштоўнасцей пачалі складаць новы інвентар. З цягам часу музейны фонд папоўніўся і за кошт камандзіровак у "раёны Гомельшчыны, адкуль вывозіліся, нягледзячы на супраціўленне мясцовых улад, кнігі, чучалы, карціны, каштоўная мэбля і г.д."[18] Так, у 1919 г. быў адкрыты мастацка-гістарычны музей імя Луначарскага 3-й катэгорыі[19], а пры музеі – бібліятэка[20]; і ўжо да 1941 г. музейны фонд складаўся з 7540 экспанатаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У тым жа 1919 г. для збору і захавання культурных каштоўнасцяў быў заснаваны Цэнтральны музейны фонд. Паводле справаздачы губаддзела, "разобрано и описано свыше 80 000 книг, брошюр, журналов и рукописей разного содержания и на различных языках. Самые редкие издания отправлены в Москву и сданы на хранение в Румянцевский музей (падкрэслена мной. - Аўт.); найдены старинные семейные хроники родовитой западно-русской аристократии, которые тоже отправлены в Москву и сданы на хранение Главархиву"[21].

Можна толькі ўяўляць, у якіх маштабах здзяйсняўся вываз культурных каштоўнасцей з усёй краіны, калі толькі з Гомеля было вывезена столькі (а гэта, пэўна ж, толькі частка ад сапраўднай колькасці). Пацярпеў таксама і Гомельскі рэгіён. Так, у 1920 г. з в. Глінішча вывезена частка рэчаў; частка каштоўных кніг і іншай маёмасці спалена чырвонаармейцамі[22] (і гэта да прыезду экспертаў!).

17 снежня 1919 г. былі дастаўлены каштоўныя літаратурныя архівы і архіўныя матэрыялы для перадачы ў Гомельскі музей імя Луначарскага, рэквізаваныя ў Ю.Талстога, былога обер-пракурора Сінода; у тым ліку: манускрыпты лістоў І.А.Жукоўскага (магчыма, нявыдадзеныя), спытак вершаў графіні Е.Растапчыной, дакумент на папіруснай паперы[23]. І такіх прыкладаў можна прыводзіць шмат…

Варта спыніцца і на кніжных выданнях, што захоўваліся ў самім Гомельскім палацы. Аглядны артыкул у "Гомельскай праўдзе" ўтрымлівае інфармацыю, што "ў фондах музея знаходзілася каля 40 старадрукаваных кніг. Найбольш цікавыя з іх належаць да першай паловы XVII ст. Па зместу падзяляюцца на тры групы. Да першай адносяцца кнігі культавыя. Яны вызначаюцца двухколерным друкам – чорным і чырвоным; да другой групы належаць кнігі "пабожнага чытання" – па-за царквой; да трэцяй – нерэлігійныя (дзве часткі Актаіха (васьмігалосніка) Мікіты Феафанава 1619 г., Евангелле 1575 г. Пятра Мсціслаўца і г.д."[24]. Таксама захаваўся рукапіс камедыі "Горе от ума" (88 арк.) А.С.Грыбаедава, які спыняўся ў Паскевіча ў 1813-1816 гг. (бо з'яўляўся сваяком жонкі князя). Гэты рукапіс мае вялікае гістарычна-літаратурнае значэнне, паколькі тэкст яго ў параўнанні з арыгіналам адрозніваецца, што дае магчымасць убачыць працу пісьменніка[25]. На жаль, рукапісны аддзел бібліятэкі Паскевіча захаваўся не цалкам, у тым ліку, "рукапісы XVI – XIX стст. на арабскай, армянскай, турэцкай мовах"[26].

Меліся і такія цікавыя для даследчыкаў кнігі: "Промышленность Могилёвской губ. до 1880 г." (авт. Дембовецкий); "Весь Гомель за 1915 г."; "Описание Добрушской писчебумажной фабрики за 1884-1894 гг."[27]. Нельга абмінуць і тое, што ў 1923 г. у губвыканкам была пададзена заява, у якой узгадваецца арыгінальны дакумент. У прыватнасці, у гэтай заяве выказвалася просьба "предоставить

возможность ... О.М.Яневичу (научному сотруднику губархива) использовать как материал по истории г.Гомеля "Отказную книгу на передачу Гомельской вотчины графу Румянцеву-Задунайскому"[28].

Тым не менш, культурныя каштоўнасці працягвалі знікаць. Варты ўвагі і такі дакумент, як "Список недостающих книг в Гомельской замковой библиотеке светлейшего князя Паскевича, составлен в июне 1893 г., исправленный в ноябре 1896 г., які сведчыць, што зніклі наступныя кнігі:

- законоведение - 3;
- изящные искусства - 1;
- географические путешествия - 3;
- история - 2..."[29] і г.д.

Але чамусьці толькі 28.09.1923 г.(?!) выдаецца загад аб выключэнні з каталога музея імя Луначарскага рэчаў і, у прыватнасці, кніг, якіх не хапае па вопісу 1896 – 1923 гг.[30]

У найноўшыя часы, калі пачалося адраджэнне культуры, з'яўляюцца звесткі аб зніклых маёнтках, разрабаваных каштоўнасцях, забытых асобах. Верыцца, што менавіта праз друкаваныя выданні (кнігі, хронікі, рукапісы і г.д.) прыйдзе да нас асэнсаванне мінулага, усплывуць невядомыя факты, якія паспрыяюць вяртанню гістарычнай памяці, і людзі, асветленыя і празрэлыя праз мудрасць кніг, стануць праваднікамі дабра і справядлівасці.

[1] Каханоўскі Г. Старыя музеі // Спадчына, 1992. - № 2. - С. 17.
[2] Виноградов Л. Гомель. Его прошлое и настоящее. - М., 1900. - С. 23.
[3] Тамсама.
[4] Каханоўскі Г. Прадвесне навукі. - Мн, 1990. - С. 70.
[5] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. - Мн, 1999. - Т. 5. - С. 428.
[6] Живописная Россия. – Мн., 1993. - Т.3; Ч.1. - С. 427.
[7] Кончин С. Эмисары восемнадцатого года. - М., 1981. - С.12.
[8] Дзяржаўны Архіў Гомельскай вобласці (ДАГомВ). Ф. 24, воп. 1, спр. 211, с. 5.
[9] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 1261, с. 12.
[10] Тамсама, с. 11.
[11] ДАГомВ. Ф. 1, воп. 1, спр. 813, с. 71.
[12] ЦДАКР РБ. Ф. 60, спр. 1266, с. 34.
[13] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 1266. с. 16-17.
[14] Марозаў В. Ф. Палац у Гомелі. – Мн., 1992. - С.15.
[15] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 1266, с. 34.
[16] Кончин Е. Пожар в Гомеле // Советская культура. - 1990. - 8 дек. - С. 15.
[17] Тамсама.
[18] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 8, спр. 1256, с. 9-10.
[19] ГАКМ. Ф. 9, спр. 9, с. 31.
[20] Філіял ДАГомВ. Ф. 1, воп.1, спр. 1532, с. 26.
[21] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 1261, с.11.
[22] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 1256, с. 46
[23] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 1256, с. 13.
[24] Калеснікава В. Мудрасць, накопленая стагоддзямі // Гомельская праўда. - 1978. - 3 чэрв. - С. 2.
[25] ГАКМ. Ф. 9,спр. 9, с. 23, 95.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[26] Тамсама, с. 44.
[27] Тамсама, с. 95.
[28] ДАГомВ. Ф. 60, воп. 1, спр. 281, с. 99.
[29] Тамсама, спр. 1266, с. 19.
[30] Тамсама, с. 17.

**Т.А. Самайлюк, Н.Я. Верас**

## ВЫДАННІ БЕРАСЦЕЙСКІХ ДРУКАРНЯЎ XVI ст.

У другой палове XVI ст. кнігавыдавецкая дзейнасць на Беларусі развіваецца ў рэчышчы рэфармацыйнага руху. Усяго на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў 60-90-я гг. XVI ст. было створана і дзейнічала восем пратэстанцкіх друкарняў: па адной у Бярэсці, Нясвіжы, Цяпіне, Лоску і чатыры ў Вільні – кальвінісцкага збору, С. і У.Сульцжэраў, М.Пяткевіча і Я. і Ю.Карцанаў, якая побач з пратэстанцкай літаратурай выдавала і контррэфармацыйную. Першай на сучаснай тэрыторыі Беларусі лічыцца друкарня ў Бярэсці, заснаваная ў 1553 г. вядомым кракаўскім літаратарам Бернардам Ваявудкам (1553-1554). Ініцыятарам яе стварэння быў віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны. Пасля трагічнай гібелі Б.Ваявудкі ў 1554 г. М.Радзівіл Чорны заснаваў новую друкарню, якую ў 1558-1561 (?) гг. узначальваў Станіслаў Мурэліус. а ў 1561-1570 (?) гг. Цыпрыян Базылік.

Да цяперашняга часу дзейнасць гэтых друкарняў застаецца мала даследаванай у беларускім кнігазнаўстве. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што "...польскамоўным выданням берасцейскай і іншых друкарняў адмаўлялі нават у частковай прыналежнасці да беларускай культуры, што з`яўляецца як найменей абсурдным"[1]. Доўгі час кнігі, выдадзеныя лацінкай, лічыліся здабыткам польскай ці літоўскай культур і практычна былі страчаны для беларускага кнігадрукавання. Да сённяшняга дня ўвогуле вывучэнне кніг лацінскага шрыфту яшчэ не стала аб`ектам шырокага навуковага даследавання ў айчынным кнігазнаўстве.

Эфектыўнасць даследаванняў у значнай ступені залежыць ад рэпрэзэнтатыўнасці прадстаўленага ў бібліяграфічных крыніцах рэпертуару выдавецкай прадукцыі друкарняў, а таксама ад паўнаты звестак аб знаходжанні экземпляраў выданняў у фондах кнігасховішч. У Беларусі вельмі мала даведнікаў, якія б досыць поўна адлюстроўвалі беларускія кнігі, выдадзеныя на замежных мовах на працягу XVI ст. Такой спробай быў бібліяграфічны дапаможнік М.Васілеўскай "Беларусь у друку XVI ст."[2]. Але ён мае свае недахопы і патрабуе значнай дапрацоўкі і перавыдання. Сёння актуальнай застаецца праблема складання поўнага рэпертуару ўсёй друкаванай прадукцыі, што выходзіла на Беларусі ў яе гістарычных межах. З



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ